# Навукова-практычная канферэнцыя

# ІМЯ Ў ГІСТОРЫІ: ЗАХОДНЕПАЛЕСКІ РЭГІЁН

## Зборнік дакладаў



**Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"**

**17-18 красавіка 2015 года**

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ПРУЖАНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

МУЗЕЙ-СЯДЗІБА “ПРУЖАНСКІ ПАЛАЦЫК”

# Навукова-практычная канферэнцыя

# “Імя ў гісторыі: Заходнепалескі рэгіён”

Зборнік дакладаў
17 – 18 красавіка 2015 г.

Брэст 2016

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беі)

**Рэцэнзент:**
*Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.*

**Навуковы камітэт:**

**Старшыня:**
*Дзямідаў Сяргей Юр'евіч, кандыдат гістарычных навук, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскга раённага выканаўчага камітэта.*

**Сустаршыня:**
*Зялевіч Юрый Сяргеевіч, дырэктар музея-сядзібы "Пружанскі палацык".*

**Адказны сакратар:**
*Пракаповіч Наталля Сяргееўна, галоўны захавальнік фондаў музея-сядзібы "Пружанскі палацык".*

**Члены камісіі:**
*Папко Вольга Мікалаеўна,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дырэктар УК "Замкавы комплекс "Мір".
*Рысь Алена Мікалаеўна*, загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела УК "Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава".

Даклады навукова-практычнай канферэнцыі прысвечаны славутым і мала вядомым асобам, лёс якіх звязаны з падзеямі ў Заходнепалескім рэгіёне. Разглядаецца шэраг актуальных пытанняў.

Зборнік прадстаўляе цікавасць для выкладчыкаў і настаўнікаў гісторыі, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй.

**На вокладцы:** музей-сядзіба "Пружанскі палацык"

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беі)

ISBN 978-985-493-386-3

© Музей-сядзіба "Пружанскі палацык", 2016
© Выдавецтва БрДзТУ, 2016

УДК 908(476.7)
ББК 63.3(4 Беі)51

*А.М. Вабішчэвіч (г. Брэст)*

## ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МІКАЛАЯ РАЗАНАВА Ў ПРУЖАНАХ У 1920 –1930-Я ГГ.: БІЯГРАФІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ З АСАБОВАЙ СПРАВЫ

Хоць па гісторыі Пружаншчыны ўжо надрукавана даволі шмат навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, аднак да сённяшняга часу не страціла сваёй адметнасці польскамоўнае даследаванне Мікалая Разанава "Пружанскі павет (гістарычны нарыс)", якое было выдадзена ў Пружанах у 1935 г. у мясцовай друкарні павятовага міжкамунальнага саюза[1]. Яно стала цяпер сапраўднай бібліяграфічнай рэдкасцю. Таму невыпадкова, што ў 2011 г. выйшла яго рэпрынтнае выданне з прадмовай "Пра аўтара і кніжку", падрыхтаванай нашчадкамі М. Разанава – дачкой Зоф'яй і сынам Славамірам[2].

Гэтая гісторыка-краязнаўчая праца атрымала яшчэ ў 1930-я гг. высокую ацэнку навуковай грамадскасці, была ўзнагароджана Польскай акадэміяй літаратуры. Аўтар выкарыстоўваў як гістарычныя, так і сацыялагічныя крыніцы. Структура яго працы ўключала выкарыстаную бібліяграфію, друкаваныя і рукапісныя крыніцы, прадмову, асноўную частку (з 5 раздзелаў), дадаткі, алфавітны паказальнік імёнаў і геаграфічных назваў. У асноўнай частцы быў выкладзены агульны агляд гістарычных здарэнняў у Пружанскім павеце (раздзел 1), становішча каралеўскіх і вялікакняжацкіх зямель, прыватных уладанняў магнатаў (раздзел 2), шляхецкіх, памешчыцкіх уладанняў (раздзел 3), стан вёсак, сялян (раздзел 4), гарадоў (раздзел 5). Ён паспрабаваў выкарыстаць статыстычны метад даследавання – лічбавыя паказчыкі былі прадстаўлены ў табліцах, у асобных выпадках падлічаны працэнтныя суадносіны. Асаблівую каштоўнасць для сучасных краязнаўцаў маюць змешчаныя ў дадатках крыніцы – прывілей 1589 г. караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы аб наданні магдэбургскага права Пружанам, прывілей 1740 г. караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III для віленскага падчашага Яна Гараіна на стараства ў Равяцічах, пацвярджэнне каралямі Рэчы Паспалітай Аўгустам III і Станіславам Аўгустам Панятоўскім ранейшых прывілеяў для Шарашова, палажэнне аб дзесятніках (дзесяцкіх), выдадзенае князем А. Чартарыйскім, і палажэнне аб запасных складах ў Шарашове.

Рэцэнзія на кнігу М. Разанава была надрукавана ў 1937 г. на старонках віленскага навуковага часопіса "Ateneum Wileńskie". Яе напісаў сакратар рэдакцыі Леанід Жыткевіч. У гэтай станоўчай рэцэнзіі было адзначана выкарыстанне аўтарам публікацый Віленскай археаграфічнай камісіі, асобных спраў з бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя і іншых крыніц. Як дасціпны вучоны (рыхтаваў дысертацыю "Літва і Карона ў 1794 г.", якую абараніў у 1938 г.), рэцэнзент зрабіў заўвагу М. Разанаву адносна слабога выкарыстання дакументаў Віленскага дзяржаўнага архіва, дзе той знайшоў бы шмат вельмі каштоўных і невядомых матэрыялаў. Пры гэтым адзначаў, што нягледзячы на навукова-папулярны характар, кніга М. Разанава ўтрымлівала шматлікія новыя падрабязнасці і стане крыніцай інфармацыі для вучоных. "Аўтар улажыў шмат працы ў сваю кнігу і аблегчыў заданне тым, хто захоча вывучаць гісторыю Пружанскага павета на больш шырокай базе крыніц"[3].

---

[1] Rozanów, M. Powiat Prużański (szkic historyczny). – Prużana, 1935. – 143 s.

[2] Rozanów, M. Powiat Prużański (szkic historyczny). – Reprint / Fundacja Pomocy Szkołom Polskim im. T. Goniewicza. – Lublin-Brześć, 2011. – 168 s.

[3] Żytkowicz, L. Recenzja monografie: Rozanów, M. Powiat Prużański (szkic historyczny). – Prużana, 1935. – 143 s. // Ateneum Wileńskie. – T. 12. – Wilno, 1937. – S. 632.

Аднак, нягледзячы на каштоўнасць выдання, асоба даследчыка М. Разанава застаецца яшчэ і зараз слаба вядомай. Яго біяграфія сціпла выкладзена ў згаданай прадмове да рэпрынтнага выдання манаграфіі, а таксама ў адзінкавых публікацыях у друку і ў Інтэрнэце[4]. Таму паспрабуем дапоўніць яго жыццяпіс па падставе польскамоўных дакументальных матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці. Упершыню ўводзяцца ў навуковы абарот звесткі з асабовай справы, якая знаходзіцца сярод дакументаў Брэсцкага акруговага праўлення Стралецкага саюза (фонд 364). Там утрымліваецца даведка кіраўніка Пружанскага павятовага аддзела Стралецкага саюза Стэфана Радкевіча ад 15 кастрычніка 1932 г. на грамадзяніна Мікалая Разанава, сакратара павятовага аддзела ў Пружанах, члена управы Стралецкага саюза[5]. На той час ён меў ужо 2-гадовы стаж знаходжання ў гэтай польскай праўрадавай маладзёжнай арганізацыі. Да даведкі дададзены копіі 7 дакументаў (датуюцца 1918–1920 і 1929 гг.), якія С. Радкевіч заверыў подпісам і пячаткай. Нягледзячы на ідэалагізаваны характар дакументаў, што тлумачыцца нацэленасцю Стралецкага саюза, які актыўна падтрымліваў рэжым "санацыі", на правядзенне паланізацыі ў Заходняй Беларусі, яны ўтрымліваюць змястоўныя фактаграфічныя звесткі, якія дапаўняюць біяграфію даследчыка.

З улікам названых і іншых крыніц вядома, што Мікалай Разанаў нарадзіўся 15 сакавіка 1898 г. у Пецярбурзе ў сям'і кадравага вайскоўца – падпалкоўніка Цімафея Маісеевіча Разанава (1846–1927 гг.), які служыў там у 145-м пяхотным Новачаркаскім палку, і Феадосіі Хладкоўскай. Штабс-капітан Ц. Разанаў прымаў удзел у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг., дзе быў паранены, узнагароджаны ордэнамі Св. Уладзіміра 4-й ступені і Св. Станіслава 2-й ступені, атрымаў званне капітана. Потым ён 5 гадоў служыў у арміі Балгарскага княства, а таксама камандаваў батальёнам, за што атрымаў ордэны Св. Станіслава 3-й ступені, Св. Ганны 2-й і 3-й ступеняў, балгарскія і сербскія ордэны. У адстаўку пайшоў генерал-маёрам[6]. Мікалай Разанаў у 1908–1915 гг. вучыўся ў кадэцкім корпусе ў Пскове. У студзені 1916 г. на "выдатна" скончыў Вышэйшую вайсковую інжынерную школу ў Петраградзе. У якасці афіцэра расійскай арміі ўвесь час – са студзеня 1916 г. да сакавіка 1918 г. – быў на фронце на перадавой лініі. Там ён прымаў актыўны ўдзел у стварэнні польскіх вайсковых фарміраванняў на тэрыторыі Расіі.

Наконт гэтага ёсць звесткі ў даведцы, выдадзенай М. Разанаву ў студзені 1918 г. камандзірам 2-га палка ўланаў (уваходзіў у склад I Польскага корпуса ў дзеючай расійскай арміі) палкоўнікам Стэфанам Сушынскім, з просьбай аб вельмі ласкавым аказанні дапамогі яе прад'явіцелю пры неабходнасці. У прыватнасці, у ёй паведамлялася, што "паручнік гвардзейскага інжынернага батальёна Мікалай Разанаў прымаў актыўны ўдзел у фарміраванні даверанага мне палка, аказваючы мне вялікія паслугі, чым далучыўся да нашай агульнай справы і заслужыў падзяку кожнага паляка"[7].

Пасля Брэсцкага міру М. Разанаў уцёк з расійскай арміі, з сакавіка да снежня 1918 г. знаходзіўся ў акупаваным нямецкімі войскамі Пскове. У снежні 1918 г. ён ужо актыўна займаўся арганізацыяй віленскай самаабароны, вельмі цесна супрацоўнічаў з ротмістрам Уладзіславам Дамброўскім, які ўзначальваў эскадрон уланаў самаабароны Віленшчыны (стаў 1-м палком віленскіх уланаў), і яго братам Ежы

---

[4] Мікалай Разанаў. – Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Мікалай_Разанаў. – Дата доступу: 20.11.2015; Mikołaj Rozanow. – Рэжым доступу: https://pl.wikipedia.org/wiki/Mikołaj_Rozanow. – Дата доступу: 20.11.2015; Sętowski, J. Cmentarz Kule w Częstochowie. Przewodnik biograficzny/ J. Sętowski. – Częstochowa: Wydawnictwo im. St. Podobińskiego Akademii im. J. Długosza w Częstochowie, 2005. – S. 257; Mikołaj Rozanow // Echa Polesia. – 2011. – № 2 (30). – S. 23.

[5] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Ф. 364. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 1–2.

[6] Розанов Тимофей Моисеевич. – Сайт «Русская Эстония». – Рэжым доступу: http://russianestonia.eu/index.php?title=Розанов_Тимофей_Моисеевич. – Дата доступу: 11.11.2015.

[7] ДАБВ. – Ф. 364. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 3.

Дамброўскім. Са студзеня 1919 г. да снежня 1920 г. служыў дабравольцам у званні паручніка 13 палка уланаў. Прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх баях, што праводзіў полк (пераход Вільня-Пружаны, баі з нямецкімі і савецкімі войскамі пры заняцці Палесся, паходы па тылах Чырвонай арміі – да Баранавічаў (сакавік 1919 г.), Маладзечна (ліпень 1919 г.), Барысава (верасень 1919 г.). За заслугі ў час змагання за Вільню быў узнагароджаны польскім знакам "За вызваленне Вільні", які ўручаўся ўдзельнікам баёў у прысутнасці Ю. Пілсудскага.

Змястоўная інфармацыя ўтрымліваецца ў службовай картцы М. Разанава, якая прызначалася польскаму Генеральнаму інспектару конніцы, і была падпісана 4 лютага 1919 г. камандзірам 13-га палка віленскіх уланаў ужо маёрам Уладзіславам Дамброўскім. Як сведчыць пачатак дакумента, яна была дадаткам да заявы М. Разанава аб прылічэнні яго да польскай нацыянальнасці. "Паручнік Разанаў яшчэ будучы афіцэрам расійскай арміі пастаянна стараўся знаходзіцца ў польскім акружэнні, вывучаў польскую мову і наогул выказваў вялікую сімпатыю да палякаў. Потым, пры фармаванні I Польскага корпуса, аказаў вялікую дапамогу 2-му палку уланаў, аб чым сведчыць камандзір палка палкоўнік Сушынскі. Потым у снежні 18-га г., будучы выпадкова ў Вільні, кінуў усе свае абавязкі і ўступіў у польскую самаабарону Віленскай зямлі, чым аказаў мне вялікую паслугу. Цудоўна валодаючы нямецкай мовай, купляў у іх сёдлы, зброю і іншую вайсковую амуніцыю для сфарміраванага мною палка віленскіх уланаў (цяпер 13 полк віленскіх уланаў). Дзякуючы яго энергіі і працы, у палку былі экіпіраваны каля 150 чалавек. Як прафесійны сапёр потым пар.[*учнік*] Разанаў пабудаваў мост праз Нёман каля Орлі, што дазволіла ўсяму атраду выбрацца з акружэння савецкімі войскамі"[8]. Безумоўна, што ў заключэнні прыведзена станоўчая ацэнка яго працы на карысць польскага нацыянальнага руху. "Як чалавек вялікай маральнай вартасці, ідэальных поглядаў на жыццё, што мае найвялікшую польскую душу, найбольш поўна заслугоўвае, каб не рабілі розніцы паміж ім і палякамі ад нараджэння. Перакананы, што і сваей далейшай працай адплаціць сваёй Айчыне – Польшчы, якая прытуліць яго як законнага і паўнапраўнага сына"[9].

Больш дэталёва пра ўдзел М. Разанава ў барацьбе за польскую незалежнасць засведчыў 6 лютага 1920 г. іншоў камандзір 13-га палка віленскіх уланаў Уладзіслаў Дамброўскі. Паводле яго звестак, паручнік М. Разанаў служыў у дывізіёне віленскай конніцы, а потым у 13-м палку віленскіх уланаў ад 28 снежня 1918 г. да 1 студзеня 1920 г. Адзначалася, што быў вельмі працавітым і мужным чалавекам, выконваў свае абавязкі вельмі сумленна, "працаваў так, як належыць польскаму афіцэру"[10]. Былі прыведзены падрабязнасці біяграфіі М. Разанава з канца 1918 г. "... 10 снежня прыехаў па асабістых справах у Вільню і там даведаўся, што ствараецца польская самаабарона. Як прадстаўнік іншай нацыянальнасці не мог у яе ўступіць, хаця быў душой на польскім баку – усяляк стараўся дапамагчы ў яе стварэнні. Знаёмы мне асабіста і даведаўшыся, што я камандую ствараемым палком уланаў, ахвяраваў мне свае паслугі і працу. Будучы цывільным, добра ведаючы нямецкую мову, купляў у немцаў экіпіроўку і зброю, нягледзячы на тое, што не меў надзеі трапіць у польскую армію, але рызыкаваў за польскую справу сваім жыццём, бо ў выпадку выкрыцця яго працы на самаабарону яму пагражала ад немцаў смяротнае пакаранне. Потым разам з капітанам Міхневічам, былым афіцэрам расійскага палка, з якім служыў, з-за адсутнасці кваліфікаваных тэхнічных афіцэраў ахвяраваў сваю працу на дабычу ў немцаў выбуховых матэрыялаў і мініраванне мастоў праз раку Вілію. За ўсе гэтыя заслугі паручніку Разанаву было прапанавана камандзірам віленскай самаабароны

---

[8] Там жа. – Арк. 4.

[9] Там жа. – Арк. 4–4адв.

[10] Там жа. – Арк. 6.

генералам Вейтка[11] уступіць у полк уланаў тэхнічным афіцэрам, на што пар.[*учнік*] Разанаў ахвотна пагадзіўся. 28 снежня 1918 г. быў зацверджаны ў якасці паручніка 1-га палка віленскіх уланаў. Прызнаючы ненармальным сваё становішча грамадзяніна іншай нацыянальнасці ў польскай арміі і жадаючы надалей заставацца афіцэрам і польскім грамадзянінам, у лістападзе 19 года падаў мне заяву аб залічэнні яго да палякаў"[12]. Гэтая заява М. Разанава была падтрымана і са службовай карткай была накіравана да інспекцыі конніцы, адтуль трапіла ў асабовы аддзел.

Звесткі аб дзейнасці М. Разанава ў 1917–1918 гг. і ў час польска-савецкай вайны ўтрымліваюцца таксама ў характарыстыцы, падпісанай 4 ліпеня 1920 г. інжынерам-паручнікам, намеснікам камандзіра артылерыйскіх майстэрань Літоўска-беларускага фронта Ст. ТрахаНоўскім. Ён засведчыў, што будучы камандзірам рухомых артылерыйскіх майстэрань, яшчэ ў складзе расійскай арміі пазнаёміўся ў ліпені 1917 г. з паручнікам М. Разанавым, які служыў тады ў сапёрным палку. "Пар.[*учнік*] Разанаў з вялікай сімпатыяй адносіўся да нас, афіцэраў-палякаў, што ўзмацніла нашу прыязнасць. Пасля бальшавіцкага перавароту ў Расіі на Ковельскі фронт быў прысланы 2-гі польскі ўланскі полк, які трэба было там фарміраваць. Пар.[*учнік*] Разанаў разам з эмісарам ад I .Польскага корпуса Тадэвушам Леванцэвічам пры дапамозе 35 салдатаў-палякаў з кампаніі, кіраўніком якой быў пар. Разанаў, дастаў зброю з чырвонаармейскіх складоў і пастаўляў 2-му палку ўланаў. Я выехаў ў Мінск ў штаб I Польскага корпуса і спаткаў пар.[*учніка*] Разанава ўжо ў Вільні, дзе мы стваралі падпольную польскую віленскую самаабарону. Разанаў праявіў сілу энергіі і жаданне служыць агульнай польскай справе, уступіў у арганізацыю, купляў у немцаў халодную зброю і амуніцыю. Калі мы вымушаны былі пакінуць Вільню, пар.[*учнік*] Разанаў пайшоў з намі, удзельнічаў ва ўсіх баях атрада самаабароны, а потым з палком маёра Дамброўскага прабіваўся да краіны і поўнасцю стаў афіцэрам таго палка, з якога ў снежні 19 г. перайшоў у даверанія мне артылерыйскія майстэрні, калі папрасіў яго аб гэтым як дасведчанага і прафесійнага афіцэра, якога да таго ж ведаў асабіста"[13]. Зыходзячы з гэтага, яму была дадзена станоўчая рэкамендацыя. "Паручніка Разанава, паводле майго працяглага назірання яго дзейнасці і маральнага пераканання, можна рэкамендаваць як чалавека і афіцэра, поўнасцю вартага даверу ў шэрагах польскай арміі"[14].

Аб службе М. Разанава ў артылерыйскіх майстэрнях Вільні сведчыць копія даведкі ад 1 ліпеня 1920 г., выдадзенай ад імя камандавання 7-й польскай арміі кватэрмайстрам Курманскім. Там адзначалася, што "паручнік Мікалай Разанаў з 19 снежня 1919 г. працаваў у артылерыйскіх майстэрнях Вільні ў якасці кіраўніка аружэйнага аддзела і сумленным выкананнем абавязкаў, прафесійнымі ведамі меў дачыненне да арганізацыі названага аддзела. Узорным выкананнем абавязкаў атрымаў прызнанне супрацоўнікаў і камандавання"[15].

Станоўчая ацэнка М. Разанава дадзена і самім генералам Уладзіславам Вейтка. У асобнай даведцы ад 25 верасня 1920 г. засведчана, што яго падначалены – паручнік Мікалай Разанаў – "быў актыўным членам польскай самаабароны Літвы і Беларусі". "Пацвярджаю, што ўвесь час быў адважным і энергічным афіцэрам польскай самаабароны і сваёй працай меў вялікае дачыненне да яе развіцця і поспехаў"[16].

---

[11] Былы генерал-маёр царскай арміі Уладзіслаў Вейтка (Władysław Wejtko) (1859–1933 гг.) быў прыняты ў снежні 1918 г. у польскую армію і прызначаны "камандзірам усіх фарміраванняў краёвай самаабароны Літвы і Беларусі, а таксама ўсіх польскіх вайсковых і паліцэйскіх атрадаў на тэрыторыі Літвы і Беларусі" (Władysław Wejtko. – Рэжым доступу: // https://pl.wikipedia.org/wiki/Władysław_Wejtko. – Дата доступу: 12.10.2015).

[12] ДАБВ. – Ф. 364. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 6адв.

[13] Там жа. – Арк. 5.

[14] Там жа.

[15] Там жа. – Арк. 8.

[16] Там жа. – Арк. 7.

Са снежня 1920 г. да заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора М. Разанаў быў паручнікам польскай арміі – служыў у артылерыйскай часці кіраўніком аружэйнага аддзела. Да ліпеня 1921 г. заставаўся там жа, але ўжо як цывільны чыноўнік.

З ліпеня 1921 г. да сакавіка 1924 г. ён ужо працаваў рэферэнтам у павятовым бюро адбудовы ў Пружанах. У сярэдзіне 1922 г. атрымаў польскае грамадзянства, стаў паручнікам запасу польскай арміі. З сакавіка 1924 г. да красавіка 1929 г. М. Разанаў быў кіраўніком дарожнага аддзела Пружанскага сейміка. Так як былі аб'яднаны дарожныя структуры, то з красавіка 1929 г. да канца верасня 1931 г. ён стаў намеснікам кіраўніка мясцовага павятовага дарожнага аддзела. З канца верасня 1931 г. працаваў сакратаром павятовага аддзела Пружанскага сейміка[17].

У час працы ў Пружанах зарэкамендаваў сябе добрым чыноўнікам. Ужо згаданы С. Радкевіч на працягу ўсіх 8 гадоў знаёмства з М. Разанавым характарызаваў яго вельмі станоўча. Хоць праз яго рукі праходзілі вялікія грашовыя сумы, аднак заставаўся сумленным чалавекам. "У прафесійнай дзейнасці заўсёды быў вельмі здольным, сумленным і лаяльным супрацоўнікам"[18]. Адносна нацыянальнага паходжання адзначалася наступнае: "Ніколі у зносінах з ім не адчуваў чалавека рускага паходжання"; "заўсёды паважліва ставіўся да Польшчы"; "у перапісах насельніцтва 1921 і 1931 гг., ва ўсіх пасведчаннях і рэестрах фігуруе як паляк"; "з рускай калоніяй адносін не падтрымлівае, знаходзіцца выключна ў акружэнні палякаў". Наконт яго веравызнання: "Праваслаўны, але не прытрымліваецца абрадаў. Пытанне аб веравызнанні для гр. Разанава абыякавае, змена веравызнання для гр. Разанава можа стаць важнай неабходнасцю толькі ў дзень яго смерці, каб знаходзіцца ў агульным пахаванні са сваёй цяперашняй сям'ёй"[19]. Давалася яму такая агульная ацэнка: "... уся яго дзейнасць характарызавалася не толькі сумленнасцю і саліднасцю, але і цягай аб клопаце пра згуртаванне мясцовага насельніцтва для інтарэсаў Польскай дзяржавы, якая з 20 гадоў яго жыцця стала фактычна яго Айчынай"[20].

У лістападзе 1928 г. ваяводскі інспектар камунальных саюзаў праводзіў праверку Пружанскага камунальнага саюза, у выніку якой выяўлены станоўчы стан дарожнага аддзела мясцовага сейміка і вельмі карысныя для павета вынікі адпаведнай працы, што прызнавалася заслугай умелага кіраўніцтва М. Разанава, яго ініцыятыўнасці, руплівасці і стараннасці. З гэтай нагоды ад імя палескага ваяводы (паводле яго ўказання) і Пружанскага павятовага сейміка яму была выказана прызнанне і падзяка за добрасумленнае выкананне ўскладзеных на яго службовых абавязкаў[21]. Таксама ў 1929 г. атрымаў сярэбраны крыж "Заслугі" за працу у органах самакіравання. Быў адзначаны генеральным інспектарам польскай арміі генералам С. Бурхардтам-Букацкім на афіцэрскай нарадзе рэзервістаў у ходзе вучэнняў 9 сапёрнага палка[22].

На момант складвання даведкі (15 кастрычніка 1932 г.) указвалася, што бацькі М. Разанава ўжо не жылі[23]. Пасля 1918 г. ён так нікога з родных больш і не бачыў. Адзіны брат жыў тады ў Эстоніі – у Рэвелі[24]. Сам Мікалай Разанаў, будучы праваслаўным, ажаніўся ў 1924 г. з полькай-каталічкай Паўлінай Пацэвіч (каля

---

[17] Тамі жа. – Арк. 1.
[18] Там жа. – Арк. 1 адв.
[19] Там жа. – Арк. 1 адв. – 2.
[20] Там жа. – Арк. 2.
[21] Там жа. – Арк. 9.
[22] Там жа. – Арк. 1.
[23] Яго бацька – генерал Цімафей Маісеевіч Разанаў, які разам з сынам, нявесткай і ўнукам жыў у Эстоніі, памёр 23 жніўня 1927 г. і быў пахаваны на Аляксандра-Неўскіх могілках у Таліне // Розанов Тимофей Моисеевич. – Сайт «Русская Эстония». – Рэжым доступу: http://russianestonia.eu/index.php?title=Розанов_Тимофей_Моисеевич. – Дата доступу: 11.11.2015.
[24] Паводле некаторых звестак, сярод расійскіх падданых, якія служылі ва Упраўленні па справах фінансаў і гандлю Паўночна-Заходняй вобласці Расіі (трэба меркаваць, што ў 1919–1920 гг.), лічыўся Іван Цімафеевіч Разанаў // Список русских подданных, состоящих на службе в Управлении по делам финансов и торговли Северо-Западной области России. – Сайт «Русская Эстония». – Рэжым доступу: http://russianestonia.eu/index.php?title=Розанов_Иван_Тимофеевич. – Дата доступу: 14.11.2015.

1897 г. – 1989 гг.), якая скончыла ў Гродне 7 класаў жаночай гімназіі. Паўліна была дачкой вядомага пружанскага ўрача Аўгустына Пацэвіча, кавалера ордэна "Адраджэння Польшчы" ("Polonia-Restituta"). У сям'і М. Разанава было двое дзяцей – дачка Зоф'я (1930–2015 гг.) і сын Славамір (1932 г. нараджэння). Ён жа працягваў працаваць у Пружанах, збіраў матэрыял і рыхтаваў да выдання згаданую ўжо манаграфію па гісторыі Пружанскага павета.

Падзеі Другой сусветнай вайны карэнным чынам змянілі лёс М. Разанава і яго сям'і. Яго мабілізавалі ў польскую армію і прызначылі кіраўніком фартыфікацыі ў Баранавічах. 18 верасня 1939 г. разам са сваім атрадам перайшоў ў Літву, дзе быў інтэрніраваны. Уцёк з лагеру і праз Швецыю дабраўся да Францыі, дзе ў лістападзе 1939 г. уступіў у сапёрныя часці Польскай арміі, стаў ад'ютантам генерала Т. Касакоўскага. Пасля капітуляцыі Францыі разам з 1-м Польскім корпусам выехаў у Вялікабрытанію. Адтуль разам з 2-м польскім корпусам накіраваўся ў Ірак і Палесціну, у 1943 г. прымаў удзел у італьянскай кампаніі. У 1946 г. вярнуўся ў Вялікабрытанію, вучыўся ў Кэмбрыджскім універсітэце[25].

Сям'я М. Разанава (жонка, дачка і сын) пасля верасня 1939 г. заставаліся ў Пружанах, якія разам з іншымі заходнебеларускімі землямі ўвайшлі ў склад СССР. Як членам сям'і польскага чыноўніка ў пачатку 1940 г. ім пагражала дэпартацыя. Яны ўцяклі за Буг – у Цярэспаль, які знаходзіўся па другі бок мяжы ад Брэста ў межах Генерал-губернатарства, якое было створана нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі акупаванай Польшчы[26]. Пасля вайны – восенню 1945 г. – пераехалі ў Чанстахову. Туды, да сям'і, вярнуўся ў 1949 г. М. Разанаў. Працаваў інжынерам-будаўніком, выкладаў англійскую мову. Там жа памёр 31 снежня 1977 г., пахаваны на мясцовых могілках Куле. Жонка Паўліна памерла ў 1989 г.

Зоф'я Разанава стала пасля Другой сусветнай вайны магістрам гісторыі мастацтва. У 1965–1991 гг. працавала ў Інстытуце мастацтва ПАН у Варшаве. Лічылася выдатным знаўцам гісторыі Чанстахоўскага Яснагорскага кляштара[27]. Памерла 4 ліпеня 2015 г., пахавана на могілках Куле ў Чанстахове[28]. Сын Славамір паспеў да пачатку Другой сусветнай вайны скончыць у Пружанах першы клас польскай пачатковай школы, дзе настаўнікам рэлігіі ў яго быў ксёндз Казімір Свёнтэк, будучы кардынал Рымска-каталіцкай царквы Беларусі, першы архіепіскап, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі. Славамір Разанаў пасля вайны скончыў гімназію, ліцэй, інжынерную школу ў Чанстахове, стаў магістрам-інжынерам. На працягу 1954–1998 гг. выкладаў у мясцовым політэхнічным універсітэце[29]. Разам з сястрой займаўся захаваннем творчай спадчыны бацькі.

У цэлым, выяўленыя архіўныя крыніцы дазволілі больш дэталёва прасачыць асобныя бакі дзейнасці Мікалая Цімафеевіча Разанава, аднаго з даследчыкаў і папулярызатараў гісторыі Пружаншчыны. Адначасова яны з'яўляюцца падставай для далейшага вывучэння яго жыцця і творчасці, як і іншых славутых дзеячаў гэтага рэгіёну Берасцейшчыны.

---

[25] Мікалай Разанаў. – Рэжым доступу: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Мікалай_Разанаў. – Дата доступу: 20.11.2015; Mikołaj Rozanow. – Рэжым доступу: https://pl.wikipedia.org/wiki/Mikołaj_Rozanow. – Дата доступу: 20.11.2015.

[26] Рэжым доступу: http://absolwent.traugutt.net/index.php?page=comment&what=abso&id=9786. – Дата доступу: 20.12.2015.

[27] Найбольш значная яе праца: Zabytki sztuki Jasnej Góry: architektura, rzeźba, malarstwo / Z. Rozanow, E. Smulikowska. – Katowice: Śląskie Centrum Dziedzictwa Kulturowego, 2009. – 511 s.

[28] Zofia Rozanow. – Рэжым доступу: https://pl.wikipedia.org/wiki/Zofia_Rozanow. – Дата доступу: 20.12.2015; Zmarła Zofia Rozanow – wybitna badaczka dziejów sztuki Jasnej Góry. – Рэжым доступу: http://www.niedziela.pl/artykul/16701/Zmarla-Zofia-Rozanow---wybitna-badaczka. – Дата доступу: 20.12.2015.

[29] Рэжым доступу: http://absolwent.traugutt.net/index.php?page=comment&what=abso&id=9786. – Дата доступу: 20.12.2015.